Нібыта ў пацвярджэнне яе слоў пачуўся званок, і ў кватэры Кургана,ззяючы ўсмешкай, з'явілася яго былая студэнтка Алеся Самахавец, якая знялася ўжо ў тэлесерыялах "Закон" і "Здзяйсненне жаданняў". Я засяпшалася ісці, але Алеся паведаміла, што забегла проста так, "пагрэцца душой". Паколькі яна збіраецца стаць мамай, мы крыху пагаварылі на гэтую тэму. Калі Ілля Львовіч пачуў, што з дзіцем зараз можна сядзець тры гады, то з сумненнем заўважыў: "Лапанька, я ведаю ваш характар і проста не ўяўляю, што вы так доўга вытрымаеце без работы...". Алеся засмяялася, а Курган растлумачыў мне: "У нас інстытут ненармальны, і людзі да нас паступаюць не зусім звычайныя. Праўда, моладзь за апошні час вельмі змянілася і гэта мяне непакоіць..."

Парасткі

— А Вы даўно выкладаеце ў Акадэміі мастацтваў? — пацікавілася я ў Іллі Львовіча.

— Я пачаў выкладаць там сцэнічную мову крыху пазней, чым стаў дыктарам, — сказаў ён. — Мне фантастычна пашчасціла: у мяне былі вялікія настаўнікі, і адзін з іх — Дзмітрый Аляксеевіч Арлоў, які добра мяне ведаў і запрасіў выкладаць сцэнічную мову ў Тэатральна-мастацкім інстытуце. Арлоў — унікальная асоба, ён адыграў вялізную ролю ў беларускай культуры, арганізаваў Рускі тэатр. Народны артыст СССР, прафесар Дзмітрый Аляксеевіч Арлоў — масквіч, але, паколькі пры Сталіне даволі доўга правеў у "местах, не столь отдаленных", у Маскве жыць яму не дазвалялася. Ён прывёз да нас высокую культуру рускага тэатра.

Да нас жа невыпадкова штогод прыязджаюць на стажыроўку маладыя французскія акцёры. Я запыталася ў аднаго парыжаніна, які вучыўся ў нас на стацыянары: "Фабрыс, якога чорта ты тут робіш? Няўжо ў Францыі няма ў каго павучыцца акцёрскай справе?" А ён і кажа: "А мне дома разумны чалавек параіў: калі хочаш стаць добрым акцёрам, трэба рускую школу прайсці, а розным хітрыкам і тут навучаць". І я гэтым ганаруся, але сёння з жахам канстатую, што школу гэтую паціху адсоўваюць амерыканскія фільмы, што ідуць на тэлебачанні. Я іх, зразумела, не гляджу, але калі натыкаюся выпадкова, думаю: "Божа, як страшна, што мы пакрысе амерыканізуемся!"

— А як мяняецца з гадамі моладзь, якая паступае ў Акадэмію мастацтваў?

— Штогод прыходзяць новыя людзі, але ўсё менш у іх духоўнасці, усё менш азоранасці. Гавораць, у нас цудоўная моладзь. Напэўна, не ведаю. Але ў нашай прафесіі без духоўнасці нельга, таму што яна ўваходзіць у прафесійную прыгоднасць.

Я цяпер вяду першы курс. Аднойчы на занятках зайшла гаворка аб культуры мовы, аб тым, што яна, па сутнасці, адлюстроўвае змястоўнасць чалавека альбо адсутнасць яе. Я кажу: "Мой сябар Сакрат..." Вось вы смеяцеся, а мне галасіць хацелася, бо па выразе твараў я з жахам зразумеў: яны сапраўды вырашылі, што Сакрат — мой сябар. Дык вось, Сакрат казаў: "Загавары, каб я цябе ўбачыў!".

Моладзь вельмі дрэнна ведае літаратуру. Я кажу: "Вы ж праходзілі гэта ў школе!" І яны сапраўды праходзілі, але — міма. А які акцёр можа атрымацца з чалавека, калі той не "хварэе на Дастаеўскага"? Так што працаваць усё цяжэй і цяжэй, хаця выпадковыя людзі да нас не прыходзяць: трэба ж вытрымаць вялізны адборачны конкурс, а потым тры туры па спецыяльнасці ды яшчэ агульнаадукацыйныя экзамены.

— Але конкурс у Акадэміі ўсё роўна вялікі, хаця ў тэатрах сёння, па-мойму, не вельмі заробіш...

— Якое там заробіш! Раней прафесія акцёра была прэстыжнай, а зараз ён — жабрак.

— Наколькі я ведаю, расійскім акцёрам асноўны заробак даюць здымкі ў серыялах, а на атрыманыя сродкі яны даволі часта пачынаюць свой бізнес. Напрыклад, адзін малады і не вельмі вядомы акцёр стаў такім чынам уладальнікам шэрагу тэатральных буфетаў, грошы ад якіх дагэтуль ішлі на ўтрыманне тэатраў...

— О Божа! Я спадзяюся толькі на тое, што, паколькі ўсё развіваецца па спіралі, адбудзецца нейкі новы віток і духоўнасць зноў стане неад'емнай і важнай рысай грамадства. Але я гэтага ўжо не ўбачу...

Гісторыя аднаго рэпартажу

Я запыталася ў Іллі Львовіча:

— Расказваюць, што Вы неяк паслалі Левітану пісьмо, дзе левітанаўскім голасам павіншавалі яго з днём нараджэння. Гэта легенда ці праўда?

— Праўда, — рассмяяўся Курган: — У Левітана быў юбілей, і павіншаваць яго прыйшлі высокапастаўленыя вайскоўцы, артысты і гэтак далей. Наш рэдактар Дубінскі паехаў у гэты час у Маскву ў камандзіроўку і адвёз Левітану плёнку з начытаным мною ўказам: "Работают все радиостанции Советского Союза! Приветствую и поздравляю..." Мне потым сам Левітан расказваў: "Я спачатку нічога не зразумеў, думаю — хто гэта? Што гэта?"

— Вы былі знаёмыя з Левітанам?

— Ну, зразумела! Ён мяне аднойчы вельмі моцна падвёў. Павінна было святкавацца 60-годдзе БССР і Кампартыі Беларусі. У Палацы спорту павінна было адбыцца ўрачыстае пасяджэнне ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і гэтак далей. Чакалі дэлегацыю з Масквы на чале з самім Брэжневым і кіраўнікоў замежных кампартый, таму што ўрачыстасці вырашылі сумясціць з міжнароднай канферэнцыяй. І я павінен быў весці рэпартаж.

А напярэдадні я сядзеў у студыі і начытваў навіны. Раптам бачу: праз шкло штосьці паказваюць і, здаецца, віншуюць. Выходжу пасля перадачы, а калегі гавораць, што прыйшоў тэлетайп аб прысваенні мне звання заслужанага артыста БССР. Указ з'явіцца ў газетах заўтра.

Той парою на нашым радыё аказаўся Левітан з сябрамі-акцёрамі: ён ездзіў па Саюзе і расказваў, як працаваў на радыё ў час вайны. Зразумела, мы адразу ж званне маё трошкі адзначылі. Потым старшыня Дзяржтэлерадыё Вячаслаў Пятровіч Палескі запрасіў мяне, дыктара Любу Батвіннік і Левітана з сябрамі выпіць з гэтай нагоды каньячку.

Раптам тэлефануе мая жонка і паведамляе, што ў нас дома ўжо сядзіць палова купалаўскага тэатра і палова Рускага: усе аднекуль даведаліся аб прысваенні звання і прагнуць тэрмінова адзначыць падзею. А гэта "байцы" Рома Філіпаў, Барыс Уладамірскі, Віця Тарасаў... І я разумею, што спаць мне не давядзецца. А як жа рэпартаж? Брэжнеў будзе ўзнагароджваць рэспубліку ордэнам Леніна ды яшчэ ў прысутнасці кіраўнікоў кампартый усяго свету! Я да Левітана: "Юрый Барысавіч, паколькі вы ў Мінску, а частка рэпартажу ідзе на Саюз, можа, вы яго праведзяце?" "Не магу, — кажа, — ад'язджаю начным цягніком, заўтра павінен быць на працы". І тады Палескі патэлефанаваў старшыні Дзяржтэлерадыё СССР Лапіну і дамовіўся, што Левітан застанецца і, паколькі гэта падзея саюзнага значэння, правядзе рэпартаж з Палаца спорту.

— Але ў той час спіс тых, хто працаваў на такіх мерапрыемствах, складаўся загадзя?

— Абсалютна так, таму Палескі тэрмінова адправіў начальніка асобага аддзела за пропускам для Левітана. Той паехаў у КДБ, але было позна, многія службы ўжо не працавалі, і яму далі пропуск не стандартны, як у нас, дзе "праход усюды" напісана, а іншы, нестандартны.

Левітан папрасіў мяне пасядзець побач з ім у студыі ў час рэпартажу, бо не ведаў нашай тэхнікі.

...Усю ноч мы святкавалі, а раніцай я прыйшоў у гатэль "Мінск". Левітан убачыў мяне і сказаў: "Ого!" Абабраў лімон і запхнуў мне ў рот цалкам. Затым пытаецца: "Ты хаця б хадзіць можаш? Давай пройдземся па марозіку пешшу, табе лягчэй стане". Прайшлі мы ГУМ, павярнулі на Паркавую магістраль, якая зараз носіць імя Машэрава, бачым: праз кожныя 50 метраў стаяць не проста міліцыянты, а сур'ёзныя людзі з зоркамі на пагонах і Левітана не прапускаюць, бо пропуск у яго нестандартны. Левітан і пасведчанне паказваў, і пазнавалі яго ўсе — гэта ж легендарная асоба, — але ў іх свае інструкцыі. Аднак знайшоўся палкоўнік — прыхільнік Левітана, які даў нам у суправаджэнне афіцэра, і з яго дапамогай мы шчасліва дабраліся да Палаца спорту. Але там Левітана перахапілі маскоўскія тэлевізіёншчыкі: папрасілі начытаць нейкі тэкст, а я падняўся на верхатуру, дзе знаходзяцца дзве ізаляваныя адна ад другой студыі. Рэдактары, аператары, гукарэжысёры, убачыўшы мяне, перапалохаліся, але я растлумачыў, што чытаць будзе Левітан. Сяджу ў студыі, чакаю, а таго ўсё няма. З'яўляецца Палескі: "Дзе Левітан? Няма?" Пазелянеў і пачаў спускацца — у яго ж хворае сэрца было.

За пятнаццаць хвілін да адкрыцця пасяджэння ля студыі з'явіліся хлопчыкі з квадратнымі плячыма і сказалі: "Усё, ніякіх хаджэнняў!" Рэдактар Стас Гаціла гаворыць: "Ілля, трэба пачынаць!" Першы экзэмпляр тэксту быў у Левітана, але адзін з рэдактараў знайшоў у сябе ў кішэні невядома які па ліку пакамечаны экзэмпляр. Гаціла паглядзеў і збялеў: "Гэта ж у крэсле ў спакойных абставінах прачытаць немагчыма, а не тое што ля мікрафона на ўсю краіну..." Аднак пачынаць трэба, бо інакш і Палескі паляціць са свайго месца, і яшчэ многія: у залу ўжо ўваходзіць Брэжнеў, кіраўнікі кампартый Кітая, Уругвая, Эквадора, прозвішчы якіх і ў нармальным стане вымавіць немагчыма. Кажу: "Стас, я разумею, так павязуць мяне аднаго, — прыйшоў, маўляў, паддаты і накалупаў..." "Не, — гаворыць, — Ілюша, ты вывезеш".

— Няўжо Вы ўсё ж такі рызыкнулі, я ведаю, што ў такіх выпадках дыктару не дазволена было нават націск няправільна паставіць?

— А што заставалася рабіць? Я пачаў чытаць. Скасіў вочы, а Гаціла ад нервовага напружання так учапіўся ў стол, што нават рука пасінела. Адно за адным называю прозвішчы, бачу: ужо Машэраў падымаецца... Я пра сябе: "Уратуй мяне, Божа!" Вымаўляю: "Кандыдат у члены Палітбюро і гэтак далей — Пётр Міронавіч Машэраў!" І Машэраў у мікрафон: "Таварышы!.."

— Паспелі?

— Цюцелька ў цюцельку! І тут у мяне была вялікая паўза. Бамбіза, які стаяў ля ўваходу, адышоў, калегі кінуліся ў студыю цiскаць і абдымаць мяне. І ніхто не мог зразумець, як мне ўдалося гэта зрабіць. Але раптам "дысталяваны" інтэлігент Стас, які да д'ябла пaслаць нікога не мог, дзесяціпавярховым на ўсіх: "...Не чапайце яго!" А я падняцца не магу: штосьці са спінай здарылася ад стрэсу.

Потым мне давялося чытаць далей, а Левітан, як аказалася, сядзеў з тэкстам у другой студыі і чакаў мяне. Пасля рэпартажу прыбягае ўзрушаны: "Што здарылася?" "Ды вось, — гавораць хлопцы, — Ілля чытаў па гэтым тэксце". Левітан зірнуў: "Кіньце, па гэтым экзэмпляры чытаць немагчыма". А калі яго пераканалі, выдаў каламбур, які потым доўга паўтаралі на радыё: "Вам не патрэбен Левітан, ёсць у вас Ілля Курган!".

Чалавекі

Прамень высвеціў маленькі абразок на пісьмовым стале. Ілля Львовіч прасачыў мой позірк і сказаў: "Гэта падарунак маёй студэнткі. Яны з мужам — шчырыя вернікі, а гэта зараз рэдкасць. Жывуць у Маскве, раз-пораз прыязджаюць. Аднойчы на занятках, калі мы працавалі над Дастаеўскім, я сказаў, што быць чалавекам — гэта вялікі талент, і Лёша Карамазаў надзелены гэтым талентам: ён перш за ўсё — чалавек. І дзяўчынка нечакана сказала: "Ілля Львовіч, дзякуй, што вы з нас не толькі прафесіяналаў робіце, але і чалавекаў".

— А што ў людзях Вы цэніце больш за ўсё?

— Мне вельмі падабаюцца людзі абаяльныя. А абаяльнымі бываюць толькі людзі змястоўныя. Да нас паступала адна прыгажуня — вачэй не адвесці! Але яна не прайшла нават на першы тур. Затое нейкае канапатае дзяўчо паступіла. У нас потым непрыемнасці былі: прыгажуня аказалася дачкой высокапастаўленага начальніка! Але на яе можна пяць хвілін глядзець, а потым што? На "челе ее высоком" нічога не адлюстроўваецца, яна халодная, як рыба. А канапатае дзяўчо святлом унутраным праменіцца! У нас жа інстытут ненармальны, і блат немагчымы, у нас талент патрэбны, унутраная змястоўнасць.

Напрыклад, Віця Тарасаў быў не вельмі арганізаваным студэнтам, не вельмі дысцыплінаваным, часта заняткі прапускаў. Але наўрад ці хто-небудзь запярэчыць супраць таго, што за шэсцьдзесят гадоў існавання інстытута ён быў лепшым. І няхай са сцен інстытуцкіх выйшла вельмі многа цікавых людзей, лепшым усё роўна быў Тарасаў!

— Я звярнула ўвагу на кнігу, якую ён Вам падпісаў: "Вялікаму чалавеку, артысту, педагогу..." Вы яго добра ведаеце?

— Мы з ім не былі сябрамі — мы з ім былі як браты. У яго здарыўся інсульт, і мы ездзілі ў вёску, дзе ён цяпер жыве. Там добра: утульны драўляны дом, прырода... Ён жа даўно не працуе. Ах, які акцёр і які мужык! Жанчыны ад яго шалелі!

— Вам шанцавала на людзей?

— Мне заўсёды становіцца сумна, калі я бачу шэры плот і людзей, якія падобныя на дошкі ў гэтым плоце. Я пакутую тады, я стамляюся. Але мне фантастычна шанцавала ў гэтых адносінах: у мяне, напрыклад, ёсць знаёмы мастак Яўген Рыгоравіч Чамадураў — цікавейшы, па-сапраўднаму змястоўны чалавек. Ён столькі бачыў! На жаль, цяпер мы з ім толькі ў шпіталі бачымся... Я закаханы ў такіх людзей, кожная сустрэча з імі для мяне — адкрыццё: яшчэ адзін востраў! Мацярык — гэта зусім іншае, гэта не тое... А гэта астравы мае, але іх становіцца ўсё менш і менш... Вялікая, легендарная Фаіна Ранеўская сказала: "Усе мае пайшлі, няма з кім пагаварыць". Я яе разумею.

Але я шчаслівы, таму што мне пашчасціла сябраваць і працаваць з дзіўнымі унікальнымі асобамі! Я добра ведаў Канстанціна Мікалаевіча Саннікава і прафесара, народнага артыста СССР Еўсцігнея Афінагенавіча Міровіча, які заснаваў тэатр імя Янкі Купалы... У нас працаваў знакаміты маскоўскі Мардвінаў, не той, што іграў у "Маскарадзе", а той, што быў у Маскоўскім Мастацкім акадэмічным тэатры ў Станіслаўскага. Пры Сталіне доўгі час ён правёў у "местах, не столь отдаленных", пасля чаго яму не дазволілі вяртацца ў Маскву. Таму Мардвінаў нейкі час жыў і працаваў у Мінску. Быў нават галоўным рэжысёрам нашага Тэатра оперы і балета.

Аб заснавальніку нашага Рускага тэатра Дзмітрыі Аляксеевічу Арлове я вам расказваў. Зараз яго дачка Таня кнігу пра бацьку склала, туды ўвайшлі і мае ўспаміны. Гэта быў фенаменальны чалавек! У тэатральнага педагога вочы і вушы асаблівыя. Арлоў чуў і бачыў імгненна!

Я яму нават гаварыў: "У вас усё ж такі ёсць рэнтгенаўскі апарацік!" Ён адразу ж адчуваў сапраўднага акцёра, сапраўдную ігру. Бо калі ў час спектакля гледачы адпускаюць рэплікі "во, як іграе!", значыць, справа дрэнь. Калі ж акцёр сапраўды добры ў сваёй ролі, нікому і ў галаву не прыйдзе зневажаць яго падобнымі заўвагамі. З Арловым я быў асабліва блізкі.

Ведаў я Скарабагатава, Ільінскага, Шэлега з цудоўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа ў Віцебску. Гэта майстры найвышэйшага класа! І не таму, што са званнямі народных артыстаў, а проста яны сапраўды добрыя майстры. Гэта часам не супадае: бывае, званне ёсць, афішы цудоўныя, але ж на сцэну званне замест сябе не выставіш...

— А што Вас засмучае?

— Мне так балюча, што ў мяне дагэтуль усё яшчэ няма ўнукаў... Я ўжо гаварыў сваім дзецям: "Мне што, самому заняцца выпрабленнем унукаў для сябе? Ну колькі я працягну яшчэ са сваім сэрцам? А ў мяне ж унікальная бібліятэка сабрана: рэдкія кнігі па мастацтве, па сцэнічнай мове, мастацкая літаратура... Каму ўсё гэта дастанецца?

— Не зусім звычайная спадчына, па сённяшніх панятцях...

— Дык я ж у гэтым сэнсе вылюдак, жыць не ўмею, таму і капіталу не нажыў. Мяне прасілі папрацаваць з мовай вельмі сур'ёзных дзядзькаў, абяцалі прывозіць на работу і адвозіць дадому. Кажу: "Не магу, у мяне свая работа". Яны: "Вам не трэба больш нідзе працаваць!" Я не згадзіўся.

— Гавораць, Вас за мяжу запрашалі?

— Аднойчы да мяне на заняткі Зіна Браварская прывяла англійскага рэжысёра з перакладчыцай, якая запыталася: "Ці можна ў вас пасядзець?" Кажу: "Сядзіце на здароўе, толькі — што толку? Ён жа ўсё роўна мовы не ведае". Яна сінхронна перакладала, а пасля заняткаў падышла і гаворыць: "З вамі хоча пагутарыць рэжысёр". І ён прапанаваў папрацаваць два гады ў Лондане. Пытаюся: "Якім чынам? Я ж у англійскім ні бум-бум, ведаю "гуд бай" і ўсё". Ён тлумачыць: "Не думайце аб гэтым, у вас будзе перакладчык. Вам наогул не трэба ні аб чым думаць: ні аб быце, ні аб грашах". Я адмовіўся.

— Але чаму?

— Уявіце сабе: жыве сабака ў будцы, якая напалову згніла, працякае... і гаспадар неласкавы, усё імкнецца нагой у бок пхнуць... Але прапануйце гэтаму сабаку камфартабельную будку з цёплым туалетам і добрага гаспадара, думаеце, ён пяройдзе? Чорта з два! Вось і ў мяне такі ж сабачы характар. Таму я і жанаты толькі адзін раз, і так доўга без жонкі жыву: не ўяўляю, як хтосьці чужы будзе перад Ірышкінай фатаграфіяй круціцца. Я і да вялікіх грошай, якія мне прапанавалі, з-за свайго характару адмовіўся. Але затое ўсё жыццё займаюся справай, якую люблю і якую лічу цікавай, і гэтым шчаслівы.

Ганна АРЦЮШКЕВІЧ.

«Блошиная» комиссионка

Прогуливаясь по городу, многие наверняка не раз натыкались на поэтически-таинственную вывеску "Антиквариат". И проходили мимо с мыслью "это не для нас", прокручивая в голове сцены из зарубежных фильмов, где антикварные лавочки — как пещеры Али-Бабы...

Журналист "Народной воли" решила посетить несколько столичных антикварных магазинов.



Как выяснилось, в большинстве своем они напоминают блошиный рынок, где совершенно случайно затерялись какие-то старинные вещички, ценные своим возрастом или редкостью. В поисках комментариев по поводу нищего антикварного ассортимента узнаю, что антиквары, пожалуй, одна из самых недоступных и закрытых профессий: "*No comments*" и никаких контактов с прессой. При этом многие владельцы подобных магазинчиков жалуются, что их обвиняют в грабительской оценке товара, иногда — в сбыте краденого...

Небогатый ассортимент "Антиквариатов" все-таки говорит об уровне жизни белорусов. Например, не хватает бабульке денег до пенсии — несет она свой [illegible] на сдачу. Или умерли старики, а их наследники распродают старинную мебель и декоративные вещицы. Краденую вещь приносят сдавать или свою собственную — проверить почти невозможно. Кто пойдет искать дачу, откуда свистнули, например, древнюю, а потому дорогую машинку *ZINGER*, или бабусю, у которой соседка "случайно" унесла серебряную сервизную ложечку?

Как рассказала мне товаровед одного из государственных магазинов "Антиквариат", до середины девяностых годов в государственных антикварных магазинах бесплатно работали сотрудники музеев. Они оценивали все поступившие экземпляры и самые ценные из них выкупали в музейный фонд. Позже эта система развалилась. Впрочем, с тех самых пор сотрудники подобных магазинов не принимают особо ценные вещи. Видимо, народ еще тогда исчерпал свои лимиты старья...

На вполне конкретный вопрос "*Чем отличается антикварный магазин от комиссионки?*" директор одного из магазинов ответила: "*Ничем*".

"*Магазин зарегистрирован как комиссионный, занимается приемом, оценкой и продажей комиссионного товара населения*, — сказала она. — *А если бы он пытался существовать за счет нескольких антикварных экспонатов, которые затерялись в коллекции барахла, то давно бы закрылся. Поэтому приходится торговать всем сразу. И косметикой (правда, свежей), и одеждой, и сувенирами. В общем, государственные магазины существуют за счет того, что приносит население*".

Антикварную ценность представляют в основном иконы, монеты и очень редко — именные предметы роскоши. Истинные ценности, говорят сотрудники "Антиквариатов", давно вывезены за границу.

Ассортимент частных антикварных лавочек покраше: вещицы выкуплены у коллекционеров или привезены из соседних стран. Но их владельцы не хотят говорить о своем бизнесе: "*Антикварных магазинов по Минску хватает. Все работают одинаково. Что мы будем рассказывать?*"

Интересным вариантом антикварного магазина оказалась в Минске "*Галерея мастацтва*" на площади Якуба Коласа. Помимо картин современных художников там встречаются и старинные вещи. Самый старенький экспонат — двухсотлетний столик. Но он не продается. Галерея приобрела его, так сказать, для интерьера. А недавно там выкупили комод и буфет голландского мастера XIX века.

Антиквариат — это роскошь. Цены на действительно старинные вещи — просто фантастические, особенно если они хорошо сохранились. Маленький комод может стоить, как современный дорогой спальный гарнитур. Вот и думайте, что лучше: поставить в угол комод и не дыша любоваться им, или все-таки обставить квартиру со вкусом и современно, а по выходным ходить в музеи.

Антиквариат считается лучшим вложением денег. С каждым годом стоимость настоящей антикварной вещицы возрастает приблизительно на четыре процента.

И еще. Тем, кто приносит в комиссионно-антикварный магазин какую-нибудь семейную реликвию, следует внимательно читать правила. Некоторые лавочки взимают немалый процент с проданного товара. Если товар долго не покупают, его уценивают, а затем берут с владельца деньги, можно сказать, "за аренду экспонентного места". Поэтому тем, кто захотел заработать на семейных реликвиях, надо быть внимательным, чтобы не нажились на нем.

Дарья ГАВРИЛОВА.

21—31 верасня ШТО? ДЗЕ? КАЛІ?

ТЭАТРЫ

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы

22 верасня — "С.В.", пластычны спектакль паводле п'есы А.Чэхава "Вішнёвы сад".

23 верасня — А.Курэйчык "Згублены рай", драма ў дзвюх дзеях. На Малой сцэне — В.Быкаў "Балада пра каханне", драматычная паэма ў адной дзеі паводле аповесці "Альпійская балада".

24 верасня — М.Сайман "Я не пакіну цябе...", трагікамедыя ў адной дзеі. На Малой сцэне — А.Папова "Муж для паэтэсы", камедыя-імправізацыя ў адной дзеі.

25 верасня — Дж.Патрык "Дзіўная місіс Сэвідж", камедыя ў адной дзеі.

26 верасня — А.Дудараў "Чорная панна Нясвіжа", містычная легенда аб любові ў дзвюх дзеях.

27 верасня — А.Дзяленддзік "Смак яблыка", камедыя ў дзвюх дзеях.

Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы

30 верасня — адкрыццё сезона — М.Мусаргскі "Хованщина", опера ў трох дзеях.

Маладзёжны тэатр эстрады

22 верасня — у рамках фэсту эстраднага танцу майстэрня Яфрэмавых прадстаўляе новы вакальна-харэаграфічны праект "Белый голубь".

23 верасня — тэатральна-гумарыстычная праграма "Данс-юмор-шоу".

29 верасня — "Эстрадны кактэйль", тэатралізаванае шоу.

Беларускі тэатр юнага гледача

21 верасня — А.Дудараў "Палачанка", трагічная легенда ў дзвюх дзеях.

22 верасня — Э.Портар "Паліяна", спектакль у трох дзеях.

23 верасня — С.Навуменка "Каліф-башмачнік", усходняя казка ў дзвюх дзеях.

22, 23 верасня — *на эксперыментальнай сцэне* — М.Лявончык, Н.Башава "Последняя дуэль", спектакль у адной дзеі.

24, 29 верасня — А.Хайт "Дзень нараджэння ката Леапольда", казка ў дзвюх дзеях.

30 верасня — С.Кавалёў "Дарога на Віфлеем", калядная казка ў дзвюх дзеях.

Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр

22 верасня — Б.Шоу "Пигмалион", раман у дзвюх дзеях.

23 верасня — П.-О.Бамаршэ "Безумный день, или Женитьба Фигаро", камедыя.

24 верасня — А.Астроўскі "Поздняя любовь", меладрама.

25 верасня — В.Шэкспір "Страсти в Виндзоре", камедыя.

26 верасня — П.Бэкеш "На глазах у женской береговой охраны", камедыя. Для дзяцей — казка "Гадкий утенок".

28 верасня — Ж.-Б.Мальер "Плутни Скапена", камедыя.

29 верасня — І.Б.Зінгер "Тойбеле и ее демон", трагікамедыя.

30 верасня — Лопэ дэ Вэга "Хитроумная влюбленная", камедыя.

Тэатральны праект "Віртуозы сцэны" прадстаўляе

28 верасня — "Амерыканскі мадэрн-балет".

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі

22, 30 верасня — адкрыццё сезона — А.Курэйчык "Пемонцкі звер", гістарычная драма.

23 верасня — Я.Купала "Адвечная песня", рок-опера.

24 верасня — С.Кандрашоў "Містэр Розыгрыш", гульні дарослых у дзвюх дзеях.

25 верасня — Я.Таганаў "Адэль", гісторыя кахання ў дзвюх дзеях.

25, 26 верасня — Ш.Перо "Хрустальны туфлік", бэль-маскарад.

Сучасны мастацкі тэатр

25 верасня — А.Ліндгрэн "Малыш и Карлсон". **ПРЭМ'ЕРА!** Б.Брэхт "Мещанская свадьба".

26 верасня — К.Драгунская "Все мальчишки — дураки". Б.Брэхт "Мещанская свадьба".

ВЫСТАВЫ

У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі — выстава твораў знакамітага армянскага мастака, жывапісца сусветнай славы Марціроса Сар'яна са збораў дома-музея М.Сар'яна ў Ерэване.

Выстава будзе працаваць да 20 лістапада.

22 верасня ў музеі адкрываецца фотавыстава *"Беларуская спадчына"* Фердынанда Рушчыца, польскага мастацтвазнаўцы, фотамастака, дырэктара Нацыянальнага музея ў Варшаве. Будзе прадстаўлены таксама адзін жывапісны твор Рушчыца, які знаходзіцца ў калекцыі музея — *"Ля касцёла"* (1899 год)

23 верасня — адкрыццё экспазіцыі заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі **Івана Дмухайлы.**

ФУТБОЛ

А суддзі хто?

Адборачны матч чэмпіянату свету па футболе паміж зборнымі Беларусі і Малдовы адбудзецца 9 кастрычніка ў 19.00 на стадыёне "Дынама". А маладзёжныя зборныя гэтых краін сустрэнуцца 8 кастрычніка ў Барысаве на мясцовым гарадскім стадыёне. Пачатак у 15.00.

Тым часам сталі вядомы імёны суддзяў, якія будуць абслугоўваць гэтыя матчы. Паядынак нацыянальных зборных Беларусі і Малдовы будуць судзіць туркі Сельчук Дэрэлі, Мустафа Эйсой і Экрэм Кан. Сустрэчу маладзёжных зборных — арбітры з Казахстана Павел Салій, Руслан Дузмамбетаў і Кайрат Сламбекаў.

12 кастрычніка у 22.00 на полі стадыёна "Даніла Мартэллі" выйдуць маладзёжныя зборныя Італіі і Беларусі. Іх сустрэчу будуць абслугоўваць албанскія суддзі Албана Янка, Сокал Авдо і Энгель Петрушы.

13 кастрычніка ў італьянскім горадзе Парма на стадыёне "Эніо Тардзіні" ў 22 гадзіны па беларускім часе пройдзе матч нацыянальных зборных Італіі і Беларусі. На гэтым матчы будуць працаваць іспанцы Карлас Мехія Давіла, Клементэ Айэтэ Плоу, Хуан Карлас Юстэ.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Паэт Віталь Гарбузаў марыць праспяваць серэнаду для сваёй каханай і стаць прэзідэнтам Беларусі

Нядаўна ў Балгарыі быў выдадзены зборнік вершаў маладых беларускіх паэтаў «Сустрэча з вясной». Сярод аўтараў, чые вершы надрукаваны ў зборніку, — журналіст «Народнай волі» **Віталь Гарбузаў.**

Як высветлілася, складальнік зборніка — амбасадар Беларусі ў Балгарыі **Аляксандр Пятроў** — сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў. Зборнік выдадзены пры падтрымцы Таварыства дружбы "Беларусь — Балгарыя".

Для Віталя Гарбузава гэтая навіна стала сапраўдным сюрпрызам — пра кнігу яму паведаміў адзін знаёмы бард. Між іншым, для Гарбузава — гэта першы ўдзел у паэтычным зборніку. Раней яго вершы выходзілі паасобку: спачатку ў "Народнай волі", потым — у літаратурным часопісе "Дзеяслоў".

"Я вельмі рады, што мае вершы былі ўключаны ў "Сустрэчу з вясной", вось толькі балгарскай моваї, на жаль, не валодаю. Цяпер прыйдзецца вывучыць", — сарамліва гаворыць малады паэт.

Як і ўсе маладыя паэты, доўгі час Віталь Гарбузаў пісаў вершы, што называецца, у стол.

"А потым дапамог выпадак, — расказвае ён. — *Для маладога чалавека галоўнае, каб на пачатку паэтычнага шляху яму нехта дапамог паверыць у сябе. У маім жыцці такіх людзей было двое — вядомы публіцыст Анатоль Казловіч, а таксама паэт і бард Эдуард Акулін. Дзякуючы гэтым творцам я і пачаў рабіць першыя крокі як паэт".*

Большасць вершаў Гарбузава — пра каханне. Сам паэт ці то абсалютна сур'ёзна, ці то жартуючы кажа, што піша пра каханне таму, што яшчэ не жанаты: *"Мае вершы пра каханне ўсе сумныя. Напэўна, не сустрэў яшчэ тую дзяўчыну, якой захацелася б напісаць нешта радаснае і светлае, каб, стоячы на каленях, прачытаць каханай гэты верш. Можа, я чалавек складаны, а можа... Карацей кажучы, месца ў маім сэрцы для той адзінай яшчэ вакантнае".*

Зараз Віталь Гарбузаў, як, напэўна, і ўсе творцы, марыць пра выданне ўласнага зборніка вершаў.


"Вось толькі грошай на такі зборнік пакуль не хапае, — гаворыць ён. — *А яшчэ вельмі хочацца, каб на мае вершы была напісана песня. Таму зараз я актыўна шукаю кампазітара, якому спадабаліся б мае вершы..."*

Віталь кажа, што разгледзіць любыя прапановы аб стварэнні песні. *"Бо сэрца каханай лепш пакарыць серэнадай"*, — гаворыць Віталь.

Даведка

Віталь Гарбузаў, паэт і журналіст.
Нарадзіўся 5 красавіка 1982 года.
Без шкодных звычак: курэнне не ў разлік.
Марыць праспяваць серэнаду для сваёй каханай, а таксама стаць прэзідэнтам Беларусі.

Даша ПАЎЛОЎСКАЯ.



ХОЧАЦЕ — ВЕРЦЕ, ХОЧАЦЕ — НЕ ВЕРЦЕ

Будучы тыдзень: зоркі прадказваюць

АВЕН. Сцеражонага бог сцеражэ. Таму не рызыкуйце дарэмна — ні на працы, ні ў асабістым жыцці. Помніце, што ваша меркаванне — не ісціна ў апошняй інстанцыі, прыслухоўвайцеся хаця б краем вуха да таго, што гавораць навакольныя. Не давярайце грошай пабочным асобам. Спрыяльныя дні — 20 і 24, неспрыяльных няма.

ЦЯЛЕЦ. Трымайце свае арыгінальныя ідэі пры сабе — тады іх не змогуць скарыстаць нячыстыя на руку людзі. Аддаючы шмат сіл працы, не забывайце і аб сабе. Не адмаўляйце сабе ў маленькіх і не вельмі дарагіх радасцях. Спрыяльныя дні — 21,22 і 23, неспрыяльны — 24.

БЛІЗНЯТЫ. Вас чакае праверка на трываласць, хутчэй за ўсё ў асабістым жыцці ці ў адносінах са сваякамі і сябрамі. На працы лепш адразу здацца начальству і падпарадкавацца яго патрабаванням. Аднак у нерабочы час па магчымасці займайцеся сваім здароўем. Спрыяльны дзень — 20, неспрыяльны — 21.

РАК. Не ўсё тое золата, што блішчыць. Тыдзень абяцае новыя магчымасці і на працы, і ў асабістым жыцці, аднак спакушацца не варта: Старайцеся паводзіць сябе цішэй вады, ніжэй травы — тады зможаце пазбегнуць дадатковых нагрузак. Займіцеся праблемамі дзяцей. Спрыяльныя дні — 22 і 26, неспрыяльны — 23.

ЛЕЎ. Штосьці не клеіцца на працы? Не фарсіруйце падзеі, вазьміце маленькі тайм-аут. Глядзіш — і прыйдзе ў галаву патрэбная думка. Ды і асабістыя праблемы даўно чакаюць вашай увагі. Някепска было б зазірнуць да ўрача (праграма-максімум — рашыцца на поўную дыспансерызацыю). Спрыяльныя дні — 20 і 24, неспрыяльны — 25.

ДЗЕВА. Надышоў час раздаваць даўгі. І для гэтага не патрэбна адыходзіць далёка ад дома — хатнія чакаюць вашай увагі і заахвочвання (не толькі матэрыяльнага). А вось павялічыць змесціва вашага кашалька не пытайцеся, не кладзіце грошы ў банк. Спрыяльныя дні — 21,22,23 і 26, неспрыяльны — 20.

ШАЛІ. Вас заваляць вельмі заманлівымі прапановамі — і дзелавымі, і асабістымі. Але ставіцца сур'ёзна да іх не варта. Не выключана, што вас хочуць ашукаць ці пасмяяцца з вас. Затое гэта някепскі час для папаўнення багажу ведаў. Спрыяльны дзень — 20, неспрыяльны — 25.

СКАРПІЁН. Назваўся груздом, лезь у кош. Менавіта такая сітуацыя ў вас і на працы, і дома. Усе ад вас чагосьці чакаюць. Аднак не спяшайцеся браць ініцыятыву ў свае рукі. Пастаўцеся да сваіх ідэй са здаровым скептыцызмам, таксама, як і да абяцанняў навакольных. Спрыяльныя дні — 22 і 26, неспрыяльных няма.

СТРАЛЕЦ. Пастарайцеся не ахвяраваць сваімі інтарэсамі нават дзеля блізкіх, а ўжо тым больш дзеля малазнаёмых людзей. У вас могуць з'явіцца дадатковыя абавязкі, якія зараз зусім не дарэчы. Не вешайце сабе хамут на шыю добраахвотна! Спрыяльныя дні — 20 і 24, неспрыяльныя — 21,23 і 26.

КАЗЯРОГ. Вы думаеце аб навакольных лепей, чым яны ёсць на самай справе. На ўсялякі выпадак не давярайце іх словам. У той жа час зараз людзі гатовы ісці вам на ўступкі — перад вашай абаяльнасцю не вытрымаюць нават уплывовыя людзі. Грэх гэта не скарыстаць. Спрыяльныя дні — 21,22 і 23, неспрыяльных няма.

ВАДАЛЕЙ. Вам складана будзе знаходзіць агульную мову з тымі, ад каго вы залежыце матэрыяльна ці маральна. Пакіньце спробы вучыць жыццю начальства і не рабіце крокаў для развіцця вашай кар'еры. Пастарайцеся часцей адпачываць, праводзіць вольны час з каханымі. Спрыяльны дзень — 20, неспрыяльны — 24.

РЫБЫ. Класік гаварыў, што прыгажосць выратуе свет. Таму надайце як мага больш увагі сваёй знешнасці. Ёсць сэнс нават паспрабаваць змяніць імідж, схадзіць у салон прыгажосці і запісацца ў фітнес-клуб. Поспех у супрацьлеглага полу перавысіць усе вашы чаканні! Спрыяльныя дні — 22 і 26, неспрыяльны — 20.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Понедельник, 20 сентября

БТ

07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12,00, 14.00, 15.00, 17.00, 18.00, 23.00 Новости.
07.05, 07.35, 08.10, 08.35 "Доброе утро, Беларусь!".
07.30, 08.30, 20.00 "Деловая жизнь".
09.05 "В центре внимания".
10.05 "Існасць".
10.30 "Пой, душа!".
11.05, 18.15 "Богатые и знаменитые". Сериал.
12.10 "Брюс всемогущий". Комедия.
14.05 "Зона X".
14.15 "Ваше лото". Телеклуб.
15.15 "Невероятные приключения командора Кусто". Мультсериал.
16.05 "5 чудес".
16.15 "Созвездие надежд".
17.05 "Кони Менорки". Сериал.
17.30 Футбол. Видеожурнал Лиги чемпионов.
19.10 "Земельный вопрос". Общественно-политическая программа.
19.30 "Время спорта".
20.05 "Возвращение Мухтара". Сериал.
21.00 "Панорама".
21.50 "Специальный репортаж".
22.05 "Я сама". Детектив.

ОНТ

07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 18.00, 20.30, 23.00 "Наши новости".
07.05 "Наше утро".
09.05 "Контуры".
09.55 "Дисней-клуб".
14.50 "Женщины в любви". Сериал.
15.45 "Фабрика звезд".
16.10 "Дом". Реалити-шоу.
17.00 "Пять вечеров".
18.15 "Жди меня".
19.05 "Клон". Сериал.
20.00 "Время".
21.05 "Выбор". Ток-шоу.
21.50 "Участок". Сериал.
23.15 "Народный артист".
23.30 "Кремль-9". "Дворцовые тайны".

РОССИЯ

07.45 "Вести недели".
08.45, 16.50 "Ундина. На гребне волны". Сериал.
09.40 "В Городке".
09.50, 18.50 "Вести. Дежурная часть".
10.00, 16.00, 19.00 "Вести".
10.30, 19.30 "Местное время. Вести — Москва".
10.50 "Бедная Настя". Сериал.
11.50 "Что хочет женщина".
16.20 "Честный детектив".
17.50 "Марш Турецкого". Сериал.
19.50 "Спокойной ночи, малыши!"
19.55 "Красная площадь". Сериал.
21.00 "Штрафбат". Драма.
22.30 "Вести +".
22.20 "Мой серебряный шар".
23.15 "Эксперт".
23.30 "Синемания".

ЛАД

06.30 EURONEWS.
08.00, 14.00, 20.45 Новости.
08.10 "Метеосфера".
08.20 ("Культура".) "Линия жизни".
09.15 ("Культура".) "Кто в доме хозяин".
09.45 "Юркины рассветы". Киноповесть.
10.55, 19.00 "Шестеро неутомимых". Сериал.
11.45 "Обычный необычный день". Семейный канал.
12.15 "Семья Кордье: судья и следователь". Сериал.
14.10 "Мир природы".
14.40 "Не зевай!"
15.15 Мультфильм.
15.30 "Бум".
15.55 "Сама себе хозяйка".
16.10 "Нежный возраст". Сериал.
16.35 "Художники". Док.сериал.
17.00 "Душа моя, Элизиум теней". Док.фильм.
17.25 "Мгновение вечности".
17.45 "Беларусь многоликая". Видеофильм АТН.
18.05 "Портрет мастера". Док.фильм.
19.50 "Дела семейные".
20.30 "Колыбельная".
21.00 ("Культура".) "Сферы".
21.40 ("Культура".) "Блеф-клуб".

НТВ

09.00, 15.00, 18.00 "Сегодня".
09.20 "Преступление в стиле модерн".
09.55 "Особо опасен".
10.25 "Отряд особого назначения". Драма.
15.15 "Принцип домино". Ток-шоу.
16.25 "Рокировка". Сериал.
17.35 "Криминальная Россия".
18.40 "Улицы разбитых фонарей-6". Сериал.
19.50 "Фабрика грез". Сериал.
21.00 "Страна и мир".
21.40 "Секс в большом городе". Сериал.
22.15 "Школа злословия".

СТВ+RenTV

06.40 "Рыцари-забияки". Мультсериал.
07.05 "Кот по имени Ик". Мультсериал.
07.35, 23.10 "Технология".
07.45 "Личный интерес".
08.25 "Супертеща для неудачника". Комедия.
09.15 "Минск и минчане".
09.25, 09.50, 16.00 Мультфильмы.
10.00 "Эволюция". Комедия.
11.40 "Из достоверных источнков".
12.00 "Час суда".
12.45 "Не от мира сего". Док.фильм.
13.30, 16.30, 19.30, 22.45 "24 часа".
13.50, 18.30 "Провинциалы". Сериал.
14.45 "Крис Эйнджел: экстремальная магия". Шоу.
15.35 "Маска". Мультсериал.
16.10 "Дом, который построю я".
16.50 "Игровой рефлекс".
17.00 "Медики". Сериал.
18.00 "Минщина. Люди, события, факты".
18.15 "Арт-экспресс".
20.00 "СТВ-спорт".
20.25 "Добрый вечер, малыш".
20.40 "Кадровый вопрос".
20.55 "Часовой механизм". Боевик.
23.20 "Столичный футбол".
23.50 "Новости СНГ".
00.05 "Энергия". Драма.
01.50 "Большая музыка".

8-Й КАНАЛ

07.00 "Ларец Марии Медичи". Детектив.
08.30, 17.50 "Телемагазин".
08.35 "Классика Уолта Диснея".
09.15 "К-игра".
09.20 "Сокровища". Док.сериал.
09.40, 19.50 "По имени Барон". Сериал.
10.25 "К-видео" — "Топ-8".
10.30, 21.10 "Убийство на счет". Триллер.
16.30 "Мультпарад" от "Бюргера".
16.45 "Гардемарины, вперед!". Сериал.
18.00 "Вор". Драма.
19.45 "Мобилизация".
20.45 "Вечарніца".
21.00 "Атомик Филмз" и "К-видео" представляют...

ТВ ЦЕНТР

04.45, 06.30 "Настроение".
07.35 "Тайна Карибского залива". Детектив.
09.35 "Окна нашего времени".
09.40 "Телемагазин".
10.00, 13.00, 17.00. 21.00 "События. Время московское".
10.15 "Дата".
11.05 "Постскриптум".
12.05 "Репортер".
12.15 "Доходное место".
12.25 "Деловая Москва".
13.15 "Инспектор Кресс". Сериал.
14.20 "Войди в свой дом".
14.30 "Православная энциклопедия".
15.00 "Регионы: прямая речь".
15.30 "Опасная зона".
15.45 "Жалобная книга".
16.25 "Прорыв".
17.15 "Алфавит". Телеигра.
18.00 "Таковы эти женщины". Сериал.
18.50 "Пять минут деловой Москвы".
18.55 "Брак по-итальянски". Комедия.
21.40 "Особая папка".
22.20 "Времечко".
22.50 "Петровка, 38".
23.10 "25-й час. События. Время московское".
23.30 "Очевидное-невероятное".
00.05 "Магия".

EUROSPORT

09.30, 20.00 Мультиспорт. "Всякая всячина".
10.00, 18.30 Мотоспорт по выходным.
10.30 Мотогонки. Гран-при Японии.
11.30, 17.00 Легкая атлетика. IAAF. Финал в Монако.
12.30 Паралимпийские игры. Летняя Олимпиада в Афинах.
13.30, 23.30 Футбол. Лига чемпионов УЕФА.
16.00 Велоспорт. Тур Испании.
18.00 Ралли. Чемпионат мира в Великобритании.
19.00, 00.30 Футбол. Еврголы.
20.30 Сумо. Гранд-турнир (Башо).
21.30 Боевые единоборства.
